Святлана Мажароўская

# Родны бераг Любові Тарасюк

Мой бераг родны, ціхая рака
Люляла-цешыла і калыхала,
І добрай вёскі цёплая шчака
Да хваляў лашчылася закахана...

*Л. Тарасюк*

Для кожнага чалавека ёсць на зямлі месца, дзе паветра мае асаблівы водар, дзе чысцейшая раса, неба блакітнейшае, дзе сэрцу надаецца такая моц, што хочацца жыць, стварацЬ, спяваць аб цудоўным краі, што завецца Радзімай.

Цудоўная прырода, прыветлівасць людзей з палескай вёсачкі Пінкавічы, што на Піншчыне, натхнілі ў свой час вялікага беларускага пісьменніка Якуба Коласа на напісанне бессмяротных твораў. Палескія ўражанні пісьменніка знайшлі глыбокае мастацкае ўвасабленне ў яго літаратурных творах — апавяданні «Бунт», трылогіі «На ростанях», вершы «Палессе» і іншых. У вёсцы ёсць народны музей паэта, школа носіць яго імя, адна з тутэйшых вуліц названа ў гонар беларускага класіка.

Менавіта тут, у доме на гэтай вуліцы, 7 снежня 1953 года нарадзілася дзяўчынка, якой было наканавана стаць паэткай, літаратуразнаўцай, кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, гонарам палескай зямлі, — Любоў Тарасюк.

Нарадзілася яна ў сям'і рабочых. Бацька, Канстанцін Міхайлавіч, працаваў рабочым і загадчыкам гаспадарчай часткі на розных прадпрыемствах і ва ўстановах горада Пінска. Маці, Надзея Паўлаўна, — у пінскай гасцініцы «Прыпяць». Іх сям'я славілася ў вёсцы тым, што мела добрую хатнюю бібліятэку. Любоў да навукі і кніг прывіваліся дачцэ з маленства. Надзея Паўлаўна ўспаміната: «У Любы з ранняга дзяцінства лепшым сябрам была кніга. Маленькай яна сама бегала ў нашу дзіцячую бібліятэку, якая знаходзілася побач. Яшчэ да школы навучылася чытаць. І калі Любу не адразу ўзялі ў школу (не хапала гадоў), яна прыбегла да мяне заплаканая і папрасіла: «Мама, запішыце мяне ў школу. Я хачу вучыцца!» Пасля гутаркі з бацькам першая настаўніца рызыкнула ўзяць Любу да сябе ў клас. І першыя паўгода дзяўчынку не запісвалі ў школьны журнал. Але ж як тут не ўпішаш, калі Люба была першай вучаніцай у класе?!»

З першага па дзясяты клас Люба Тарасюк у школе была выдатніцай. Школьную праграму яна засвойвала без асаблівых намаганняў. З пачатковых класаў любіла чытаць мастацкую літаратуру. Прыцягненне да літаратуры ўсё больш авалодвала таленавітай дзяўчынкай. Рана праявілася ў Любы цікавасць да паэтычнага слова. Ужо ў 9-гадовым узросце яна складала першыя вершаваныя радкі. Свае першыя вершы яна прысвяціла малой радзіме, роднаму Палессю, славутаму песняру: «Палессе», «Мне любы...», «На радзіме Коласа». У старэй-

шых класах Люба наведвала школьны літаратурны гурток «Веснавыя ручайкі», з'яўлялася рэдактарам літаратурнай газеты.

Упершыню ў друку яе вершы з'явіліся ў 1966 годзе ў газеце «Піянер Беларусі»:

Мой родны край, мой край палескі,
Ты сэрцу мілы, дарагі,
Вясною тут цвітуць пралескі,
Сінеюць летам васількі...
Цвіціце, кветкі, на ўзлессі!
Шуміце, нівы, як прыбой!
Мой родны край, мой край палескі,
Навекі сэрцам я з табой.

*(«Піянер Беларусі» 1966г.)*

У старэйшых класах любімым настаўнікам паэткі стаў настаўнік беларускай мовы і літаратуры Іван Іосіфавіч Калоша. Ён падтрымліваў дзяўчыну ў яе захапленні літаратурай і паэзіяй. «Мяне радавалі яе вершы, — успамінаў Іван Іосіфавіч, — глыбіня пачуцця адчувалася ў кожным творы. А калі яе вершы пачалі друкаваць у газетах «Піянер Беларусі» і «Палеская праўда», шчасце ахінала маё сэрца. Водгукі на прачытанныя кнігі вылучаліся любоўю да літаратурнага слова. Любіла Люба падарожжы па родным краі. З вучнямі свайго класа яна наведала радзіму Я. Коласа, Я. Купалы, мінскія літаратурныя музеі. У час падарожжаў былі запамінальныя сустрэчы з братам Якуба Коласа Іосіфам Міхайлавічам, сустрэчы з такімі пісьменнікамі, як Іван Шамякін, Іван Навуменка, Пімен Панчанка, Максім Танк. Мне, як настаўніку, прыемна адзначыць, што з «Веснавых ручайкоў», школьнага гуртка аматараў літаратуры, Люба Тарасюк улілася ў рэчышча літаратурнай ракі — Саюз беларускіх пісьменнікаў».

Удзел у літаратурным гуртку, літаратурных вечарах, сустрэчы з пісьменнікамі вызначылі далейшы жыццёвы шлях Любы Тарасюк. На працягу ўсіх школьных гадоў дзяўчынка паказвала толькі выдатныя веды па ўсіх прадметах. Аб гэтым сведчаць сшыткі і дзённікі, якія беражліва захоўваюцца ў Пінкавіцкай сельскай бібліятэцы. А скончыўшы ў 1970 годзе Пінкавіцкую сярэднюю школу імя Якуба Коласа з залатым медалём, выпускніца вырашыла звязаць сваё жыццё з літаратурай, паступіўшы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

За час вучобы ва ўніверсітэце думкі аб малой радзіме, аб родных і блізкіх, што засталіся ў вёсцы Пінкавічы, не пакідалі яе. Малая радзіма для паэткі — яснае і светлае імя, любоў да якой не мае меркі. Такая была яе любоў да Айчыны.

Сваю Айчыну ўбач і зразумей,
І ў ёй сябе ты зразумееш потым.
Сваёй Айчыны яснае імя,
Нібы ўласнае — Не дай запляміць...

*(«Імя Айчыны»)*

Паэзія і навука цесна перапляліся ў яе жыцці. «Піна і Прыпяць Вашага жыцця цяклі па-рознаму, — пісалі ёй супрацоўнікі НДЛ беларускага фальклору, — штурхаючы Вас то да берага навукі — фалькларыстыкі і літаратуразнаўства, то да глыбінь паэзіі роднага слова. Ваш лёс прадвызначаны непарыўнай прывязанасцю да родных краявідаў — Пінкавіч, Прыпяці, да бацькоў, сваякоў і гаваркіх родных студняў і весніцаў...». Эмацыянальнасць твораў Любы Тарасюк спалучаецца з філасофскім роздумам над гісторыяй і сучаснасцю.

..Яшчэ душа баліць — і тым яна жывая.
Як выказаць, аб чым баліць яна, аб чым?..
Ёсць гэты боль-нясцерп, што ўсю мяне зжынае...
Мы зноў з табой, душа, як на пачатку поля.
Было б што сеяць там і жаць было б каму.

*(«Яшчэ душа баліць»)*

Скончыўшы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з чырвоным дыпломам, Любоў Канстанцінаўна працягвала вучобу ў аспірантуры, пасля заканчэння якой (1978) працавала выкладчыкам у БДУ. У 1985 годзе яна абараніла дысертацыю на тэму «Вернасць вытокам. Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі». Любоў Тарасюк добра адчувала, што шанаванне спадчыны малой радзімы — крыніца абуджэння пачуцця нацыянальнай годнасці і аснова духоўнасці. Ведала гэта, глыбока ўсведамляла як даследчык беларускай культуры, фальклорных традыцый у нацыянальнай літаратуры. «...Але для ўсіх пакаленняў фальклор быў і застаецца носьбітам патрыятычных ідэй, выхоўваючы ў кожным паэце пачуццё гістарычнай Бацькаўшчыны...» — пісала яна.

У 1988 годзе Любоў Тарасюк становіцца дацэнтам кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1993 года да верасня 2005 года яна працавала на гэтай кафедры. Выкладала гісторыю беларускай літаратуры XIX — пачатку XX ст. і вусную народную творчасць.

Творчасць жа самой Любові Тарасюк не шумная і не гулкая, а па-беларуску сціплая, удумлівая, няспешная і па-сапраўднаму адухоўленая. Рака яе жыцця і творчасці поўная лірычных пачуццяў, глыбокіх думак і духоўнага досведу. Нездарма зборнік яе вершаў называецца «Смага ракі». Вершы Любові Тарасюк, прысвечаныя ў тым ліку і роднай вёсцы Пінкавічы, увайшлі ў «залаты фонд» айчыннай паэзіі.

Пачаткам сваёй літаратурнай дзейнасці паэтка лічыла 1972 год, калі ў часопісе «Маладосць» была надрукавана нізка яе вершаў. Потым некалькі прыкметных паэтычных публікацый былі змешчаны ў розны час на старонках часопіса «Маладосць» і штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», каля дваццаці яе вершаў былі ўключаны ў кнігу «Галасы вёснаў» (1997), што выйшла ў серыі «Школьная бібліятэка», анталогію беларускай паэзіі «Краса і сіла» (2003).



На кафедры. З супрацоўнікамі



Любоў Тарасюк з бацькамі

Калі гаварыць пра дасягненні Любові Тарасюк, то з самых значных пералічым наступныя: кандыдат філалагічных навук (1980), член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1981), сябра рэдкалегіі часопіса «Маладосць», таксама яна ўзначальвала суполку філалагічнага факультэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991—2005). Любоў Канстанцінаўна даследавала беларускую літаратуру XIX — пачатку XX ст., акрамя гэтага яна — вядомы крытык і літаратуразнаўца, аўтар манаграфій «Вернасць вытокам: Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985), «Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX — пачатку XX ст.» (1999), навучальнага дапаможніка для школ, ліцэяў, гімназій, ВНУ «Беларуская літаратура: XI — пачатак XIX стст.» (1999; у суаўтарстве). Сваю апошнюю кнігу «Апалогія красы» Л. Тарасюк выдала ў 2003 годзе. У кнізе ўдумлівыя, тонкія назіранні над паэтычным словам М. Багдановіча, А. Зязюлі, К. Сваяка і іншых паэтаў.

Кранае сэрца яе паэзія, якая ўмее высвятліць галоўнае, вызначыць сэрцам. Выток жыцця і творчае яе прычасце — беларускае Палессе, вёска Пінкавічы. Многія вершы паэткі напоўнены любоўю да роднай старонкі, павагай да яе працавітых людзей. Вытокі свайго таленту яна бачыла ў радзінных каранях.

Любоў Тарасюк шмат зрабіла для нацыянальнай адукацыі і культуры як асветніца і педагог. За трыццаць гадоў працы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце асабліва шмат часу аддавала стварэнню літаратуразнаўчых навукова-метадычных прац. Іх у яе — больш за 200.

Любоў Тарасюк — вядомы гісторык беларускай літаратуры і крытык. На яе творчым рахунку звыш 150 літаратуразнаўчых і метадычных прац. Вялікая колькасць яе публікацый прысвечана даследаванню і вывучэнню гісторыі станаўлення мастацкіх кірункаў і плыняў у беларускай літаратуры. Любоў Тарасюк шмат зрабіла для нацыянальнай адукацыі і культуры як асветніца і педагог.

Любоў Канстанцінаўна была надзвычай прыгожым чалавекам, знешне і ўнутрана, далікатным, эмацыянальным; баялася пакрыўдзіць каго-небудзь неспра-

вядлівым словам, учынкам, а сама цяжка перажывала крыўды. Не ўмела змагацца за сябе, але смела кідалася ў бойку, калі несправядліва абыходзіліся з іншым чалавекам. Для яе вызначальным было слова «справядлівасць». Любоў Канстанцінаўна была патрыётам сваёй Айчыны, клапацілася пра развіццё беларушчыны. Была шчаслівым чалавекам, бо займалася любімай справай, надзвычай была прывязана да роднага дома, бацькі і маці, да Палесся.

Хочацца прывесці словы некаторых літаратуразнаўцаў пра Любоў Тарасюк, пра яе філалагічную працу і паэтычную творчасць.

Любоў Гарэлік: «Яе паэзія — шчырая, усхваляваная споведзь, духоўны змест якой і маральна-этычныя крытэрыі суаднесены з любоўю да маці, да бацькоўскай зямлі, палескіх краявідаў. Эмацыянальнасць спалучаецца з філасофскім роздумам над гісторыяй і сучаснасцю, над экалагічнымі праблемамі. Глыбіня пачуццяў прыраўноўваецца да хуткацечнай рачной плыні, выразнасць думкі — да яснасці «прасторы». У эстэтыцы Л. Тарасюк прадметна-рэчыўныя паняцці зближаюцца з абстрактна-разумовымі. Роздум над праблемамі сучаснасці, лёсам беларускага народа, яго духоўнымі і культурнымі здабыткамі высвечваецца праз гістарычныя экскурсы ў глыбіні мінулых стагоддзяў».

Ірына Бурдзялёва: «Мы не былі блізка знаёмыя, але ведалі адна адну, бо асяроддзе людзей, якія звязалі свой лёс з беларускай філалогіяй дастаткова кампактнае. Пры сустрэчы на вуліцы або на літаратурных вечарынах мы заўсёды шчыра віталіся. Як для любога філолага, для мяне аўтарытэт Любові Канстанцінаўны быў вельмі высокі. Кожны яе надрукаваны матэрыял меў нечаканую навізну і выяўляў арыгінальны погляд на, здавалася б, даўно вядомыя з'явы класічнай літаратуры. Так атрымалася, што Любоў Канстанцінаўна была экспертам маёй кандыдацкай дысертацыі. Мяне ўразіла глыбіня пранікнення ў сутнасць тэмы і ўважлівае стаўленне да маёй працы. Любоў Канстанцінаўна жыла сваёй справай і ўсё, што тычылася беларускай літаратуры, праблем яе развіцця, не магло не выклікаць яе жывую зацікаўленасць. Для мяне яна заўсёды застаецца прыкладам найвышэйшага прафесіяналізму».

Наталля Базар: «Мова твораў Л. Тарасюк даволі багатая, выразная, сакавітая. Кожнае слова прадумана, кожная страфа нясе пэўную думку і прымушае чытача разважаць, унікаць у сэнс напісанага. У яе паэзіі можна знайсці розныя віды інтэртэкстуальнасці. Пра гэта сведчаць эпіграфы, выкарыстанне розных вершаваных форм, наяўнасць алюзій, адчуванне ўплыву іншых мастакоў слова, традыцыйнасць сюжэтаў і вобразаў, звязаных з фальклорам. Усё ўказвае на высокі інтэлектуальны патэнцыял і эрудыцыю паэтэсы. Літаратуразнаўца Алесь Бельскі так сказаў пра творчасць паэтэсы: «Паэзія Любові Тарасюк — гэта яскравы адбітак духоўнага жыцця асобы, якая ўсё галоўнае і сутнаснае ўмее высвятліць і вызначыць сэрцам». І сапраўды, яе паэзія, як рака творчасці, — спакойная, глыбокая, без віроў».

Любоў Канстанцінаўна сваю апошнюю жыццёвую сцяжыну прайшла ля гаючых крыніц і скрыпучых лесніц родных Пінкавіч, а потым вярнулася туды, дзе ўжо была пры жыцці: у вечнасць Паэзіі, Гармоніі і Красы.

А ў гэтым ужо і сапраўдная загадка светлага і драматычнага лёсу Любові Канстанцінаўны Тарасюк — таленавітай паэткі і выдатнага выкладчыка, сумленнага, разумнага чалавека, прыгожай жанчыны.

...Вяртаюся, адкуль прыйшла, — у зямлю.
Паўстане ў кветцені мой след глыбокі,
І панясуць бялюткія аблокі
Маё безабароннае: люблю...

*(«Развітанне»)*

Любоў Канстанцінаўна Тарасюк заўчасна, пасля працяглай хваробы, памерла 16 чэрвеня 2006 года ў Пінкавічах.



Любоў Тарасюк

Кожны год у дзень нараджэння Любові Тарасюк, 7 снежня, у Пінкавіцкай сельскай бібліятэцы адбываюцца літаратурныя вечарыны, прысвечаныя знакамітай землячцы. Бібліятэкары рыхтуюць кніжныя выставы паводле яе творчасці. На мерапрыемствы запрашаюцца вучні Пінкавіцкай сярэдняй школы імя Я. Коласа. Доўгі час на гэтыя сустрэчы прыходзіў і бацька Любові Тарасюк Канстанцін Міхайлавіч. Тут гучаць вершы паэткі, сваімі ўспамінамі аб ёй дзеляцца жыхары роднай вёскі. Святочны настрой падтрымліваюць удзельнікі фальклорнага калектыву «Крыніцы». Вялікую цікавасць выклікае і створаны ў бібліятэцы куток памяці Любові Тарасюк, дзе захоўваюцца яе асабістыя рэчы, кнігі, дыпломы і дыпломныя работы.

Творчасць Любові Тарасюк успыхнула ярка і непаўторна, каб у самым росквіце нечакана абарвацца. Аднавяскоўцы ганарацца сваей таленавітай зямлячкай і плацяць ёй удзячнай памяццю.

Бясцэнным скарбам у сваіх руках трымаю рукапіс неапублікаваных вершаў Любові Тарасюк, у якіх суквецце пачуццяў — любоў да роднай зямлі, да роднага слова, а таксама нешта сваё, вельмі асабістае.

Гэтыя творы і прадстаўляем шаноўнаму чытачу часопіса «Полымя».